Прапаганда і жыццё

# СПРАВАЙ І СЛОВАМ КАМУНІЗМУ СЛУЖЫЦЬ

Працоўныя Мінскай вобласці, як і ўсіх абласцей рэспублікі, актыўна змагаюцца за датэрміновае выкананне велічных планаў сямігодкі. Вялікая мэта—камунізм натхняе савецкіх людзей на гераічныя подзвігі.

Цяпер, калі пабудова камунізма стала практычнай задачай дня, першачарговае значэнне набывае ідэалагічная работа і асабліва партыйная прапаганда. У пастанове ЦК КПСС «Аб задачах партыйнай прапаганды ў сучасных умовах» падкрэсліваецца неабходнасць глыбокага засваення працоўнымі камуністычнага светапогляду. Выхаванне новага чалавека, цалкам свабоднага ад перажыткаў мінулага, патрабуе выкарыстання разнастайных форм і сродкаў работы ў масах.

Прыгадваюцца словы Уладзіміра Ільіча Леніна, сказаныя ім, калі трэба было растлумачыць рабочым і сялянам сутнасць плана электрыфікацыі. У. І. Ленін тады пісаў, што ўсе, маючыя дастатковую падрыхтоўку, навуковую або практычную, павінны быць пагалоўна мабілізаваны для прапаганды плана электрыфікацыі. Гэтыя ленінскія словы з вялікай сілай гучаць і сёння.

Усе нашы агітатары, прапагандысты заклікаены весці актыўную прапаганду рашэнняў XXI з'езда партыі, снежаньскага Пленума ЦК КПСС, XXIV з'езда КП Беларусі, мабілізоўваць кожнага савецкага чалавека на штодзённую барацьбу за паспяховае выкананне заданняў сямігодкі.


С. ПРЫТЫЦКІ

**Першы сакратар Мінскага абкома КПБ**


ботнікі выступаюць з лекцыямі і дакладамі аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці заснавальніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна.

Палепшаецца прапагандысцкая работа ў Дзяржынскім раёне. Тут гэтай важнейшай партыйнай справай штодзённа займаюцца першы сакратар райкома КПБ тав. Жагалоў, члены бюро райкома. Яны выступаюць перад насельніцтвам з палітычнымі дакладамі, праўляюць, як працуюць сетка партыйнай асветы, лектарская група і група дакладчыкаў райкома, агіткалектывы. Партарганізацыі праяўляюць шырокую ініцыятыву ў правядзенні масава-палітычнай работы.

Нядаўна, напрыклад, перадавая цялятніца калгаса імя Сталіна Яніна Вікенцьеўна Бандак была ўзнагароджана ордэнам Леніна, а свінарка Вольга Іванаўна Баран — медалем «За працоўную доблесць». У сувязі з гэтым у сельгасарцелі быў праведзен «Дзень працоўнай славы». На сходзе калгаснікаў прысутнічалі кіруючыя работнікі раёна. Адбыліся выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці. Неўзабаве «Дзень працоўнай славы» пачаў праводзіцца ва ўсіх сельгасарцелях раёна.

Узмацніў агітацыйна-масавую работу і Уздзенскі райком партыі. Ра-

нанне абавязацельстваў, якія ўзяты на 1960 год. Перад членамі арцелі даўно не выступалі партыйныя работнікі. Палітгурток, які створан пры партарганізацыі, спыніў сваю дзейнасць.

Такія факты не адзінкавыя ў Пухавіцкім раёне. Не праводзяцца заняткі ў гуртках пры партыйных арганізацыях калгасаў імя Заслонава, «Першае мая», імя Свярдлова і іншых. У гэтых сельгасарцелях запушчана работа з людзьмі.

Кіраўнікі Пухавіцкага райкома чамусьці не заўважаюць таго, што асобныя прапагандысты не могуць старанна рыхтавацца да заняткаў з-за таго, што ім прыходзіцца выконваць шмат іншых даручэнняў. Напрыклад, сакратар партарганізацыі Дукорскага сельсавета тав. Коханаў, ён жа і прапагандыст, мае... 12 даручэнняў. Коханаў і рэдактар шматтыражнай калгаснай газеты, і старшыня сельскай групы членаў Таварыства па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў, і нештатны інструктар райкома партыі, і нештатны інспектар раённага аддзела народнай асветы, і кіраўнік метадычнага аб'яднання настаўнікаў і г. д. Відавочна, што чалавек гэты не ў сілах паспяхова выконваць усе абавязкі, якія на яго ўскладзены.

Нельга мірыцца і з тым, што асобныя райкомы, іх аддзелы прапаганды і агітацыі цікавяцца толькі колькасным бокам справы. Яны не ўваходзяць у ідэйны змест заняткаў, лекцый, дакладаў, тэматычных веча-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы